Мама прыйшла

Быў зімовы вечар. Мама яшчэ не вярнулася з работы. Зоя чакае яе.

За акном гудзе завіруха. Дзяўчынка трывожна прыслухоўваецца да завывання ветру. Ёй здаецца, што за акном страшны звер. Вось ён грукае лапай у шыбу. Зоя ад страху заплюшчыла вочы.

Вось і мама прыйшла. Яна абняла Зою і пацалавала. За акном ужо не выла завіруха. Ціха шумеў вецер. Ён лагодна дакранаўся да шыбы. Зоя падышла да акна. Над зямлёю весела кружыліся белыя сняжынкі.



Падбярыце сінонімы

завіруха	выглядае
кружыліся	завывае
гудзе	не прыйшла
не вярнулася	мяцеліца
грукае	ляцелі
чакае	кружыць
абняла	завея
лагодна	стукае
	пяшчотна
	прытуліла

Прыйшла мама

Зімовы веч..р. За акном гу..е завіруха. Мама яшч.. не в..рнулася з работы. Зоя ч..кае яе. Дзя..чынка тр..вожна прыслухоўвае..а да завыва..я ветру.

Ёй здае..а, што за акном страшны звер. Вось ён грукае лапай у ш..бу. Зоя ад страху заплюшч..ла вочы.

Прыйшла мама. Абняла Зою, пац..лавала. За акном ужо не выла завіруха. ..іха шуме.. ве..ер, ён лагодна дакрана..ся да шыбы. Зоя падышла да акна. Над з..млёю весела круж..ліся белыя сн..ж..нкі.

Прыйшла мама

1. Зімовы вечар.
2. Завіруха як страшны звер.
3. Усё змянілася.

гуд..е

яшч.. не вярнулася

тр..вожна пр..слухо..вае..а да завыва..я

грукае ў шыбу

заплюшч..ла

пацалавала

лагодна дакранаўся